Славінскі Ф.

# ГЕРОЙ ДНЯПРОЎСКАЙ ПЕРАПРАВЫ

**З. С. Гарэлік – наш зямляк. Нарадзіўся 19 лістапада 1904 года ў прыстанцыйным пасёлку Асіповічы (цяпер горад Асіповічы). У пачатку 1919 года уступіў у члены Камуністычнага Саюза Моладзі. У 1924 годзе разам з сям'ёй пераехаў у Сімферопаль. Там закончыў камву Член ленінскай партыі з 1927 года. Прымаў актыўны ўдзел у калектывізацыі.**

**Зіновій Самуілавіч закончыў курсы ўдасканалення каманднага саставу "Выстрал". З першых дзён Вялікай Айчыннай вайны – камандзір стралковай роты. Удзельнічаў у баях на Паўднёвым, Цэнтральным, Сталінградскім і Беларускім франтах. За паспяховае правядзенне дэсантнай аперацыі па фарсіраванню Дняпра З. С. Гарэлік удастоены звання Героя Савецкага Саюза.**

**Зіновій Самуілавіч у 1968 годзе наведаў Асіповічы, горад, дзе прайшло маленства і юнацтва. Тады мне і давялося сустрэцца і гутарыць з гэтым цудоўным чалавекам.**

**А праз год яго не стала. Памёр З. С. Гарэлік у г. Сімферопалі.**

**Гараджане шануюць памяць героя-земляка. Адна з вуліц нашых Асіповіч носіць яго імя.**

**Аб асобных эпізодах з ваеннага жыцця З. С. Гарэліка наш расказ.**

...1943 год. Украіна. Змрок асенняй ночы акутаў дняпроўскія берагі. Амаль не чутна плёскату вады.

Схаваўшыся на другім беразе і адчуваючы сябе ў поўнай бяспецы за шырокай вадзяной заслонай, вораг маўчаў. Нашы салдаты дзелавіта, не губляючы часу, наводзілі пантонныя масты, рабілі плыты, спускалі на ваду ўсё тое, што магло служыць сродкамі пераправы.

Каля аднаго з плытоў размясцілася чацвёртая стралковая рота старшага лейтэнанта Зіновія Гарэліка. У гэтай роце ён адзіны афіцэр, камандзіры ўзводаў выбылі, ў час апошніх цяжкіх баёў. Ды і салдат не вельмі многа. Нягледзячы на стому, ніхто з байцоў не думаў аб адпачынку. Ціха размаўлялі, абмяркоўвалі, як лепш выканаць загад.

Прыўзняты, баявы настрой падначаленых радаваў камандзіра роты. І ўсё ж старшы лейтэнант Гарэлік хваляваўся. Вопытны камандзір, загартаваны франтавік добра ведаў, што лёгкай удачы не будзе, адчуваў, што на выгадным рубяжы вораг акажа моцнае супраціўленне.

І вось ад зарослага хмызняком берага пачалі аддзяляцца першыя лодкі, крануліся плыты. Фарсіраванне пачалося.

Гітлераўцы не адразу адчулі небяспеку. Потым ліхаманкава замітусіліся. Над ракой завіслі асвятляльныя ракеты. Процілеглы бераг стаў вызначацца агнявым поясам. Рваліся снарады і міны, уздымаючы слупы вады. Але ўжо нішто не магло спыніць нашых воінаў. Яны ўпарта прабіраліся праз вогненную заслону. Вось на правым беразе адваявана палосачка зямлі. Гэта не спадабалася ворагу, і ён з кожнай хвілінай узмацняў агонь па пераправе.

Байцы чацвёртай стралковай дружна наляглі на вёслы (замянілі іх жэрдкі, дошкі і інш.). нягледзячы на іх намаганні, здавалася, што плыт амаль не рухаецца. Ад разрываў снарадаў кіпела вада.

Вось і бераг. Старшы лейтэнант Гарэлік з ходу выбраў пазіцыю, і байцы рушылі на збліжэнне з ворагам, Ужо бачна праз сіняву ранішняй дымкі, як каля гармат завіхаюцца нямецкія артылерысты, Па камандзе рота раздзялілася на групы, устаноўлены кулямёт. Адкрылі агонь па ворагу. У паніцы фашысты. Рота імгненна атакуе. Сутычка каля гармат – і ўсё скончана. Знайшліся сярод салдат і артылерысты. Захопленыя гарматы пачалі біць па ворагу. Гэтым часам пераpraўляліся астатнія падраздзяленні.

Рота Гарэліка адна з першых увайшла ў вёску Шчытцы. Загад: замацавацца на гэтым рубяжы. Камандзір разгарнуў карту і агледзеў мясцовасць. Дарога праз населяны пункт вядзе да Дняпра. Калі вораг пачне падцягваць сілы ў напрамку плацдарма, то абавязкова праз гэту вёску.

Інтуіцыя не падвяла. Праз паўтары-дзве гадзіны на дарозе паказаліся фашысты.

– Падпусціць бліжэй, без каманды не страляць!

Адлегласць паміж акопамі і першымі шарэнгамі стала нязначнай. Тады пачулася каманда:

– Агонь!

Дружны залпавы агонь выклікаў разгубленнасць у ворага. Немцы падаліся назад.

Першая атака адбіта. Але за ёй наступіла другая. На гэты раз пяхота ішла ўслед за танкамі. Салдаты рыхтавалі звязкі гранат. Пяхоту ад танкаў адрэзалі кулямётным агнём. Яна залегла. Танкі ж ішлі ўперад. Насустрач ірванулася група воінаў. Пад гусеніцы паляцелі звязкі гранат. Удалося падбіць два танкі. Праціўнік спыніўся. Якраз пераправілася і наша артылерыя. А калі потым рушылі шэсць нямецкіх танкаў, артылерысты стрымалі іх, ударыўшы з фланга. Немцы сталі паспешліва адыходзіць.

Рота праследавала ворага і пасля паспяховага правядзення контратакі адбіла ўскраіну лесу. Зноў завязаўся жорсткі бой. Гітлераўцы, схаваўшыся за дрэвамі, абстрэльвалі кожны крок. У час перабежкі старшы лейтэнант Гарэлік адчуў, як апякло руку. Але ранены камандзір застаўся ў страі.

Нечакана на паляну з-за дрэва выскачыў нямецкі афіцэр. Гарэлік рвануўся да яго. Той узняў пісталет, але выстраліць не паспеў. Ротны з

размаху ўдарыў яго па галаве. У гэты момант дзесьці побач прагучала аўтаматная чарга. З вострым болем у паясніцы камандзір упаў...

Не чуў, як выносілі яго з лесу, як пераправлялі на другі бераг Дняпра. Ачнуўся толькі ў палявым шпіталі.

У час лячэння ўсхвалявала радасная вестка. Зіновія Самуілавіча Гарэліка віншавалі з высокай узнагародай – прысваеннем звання Героя Савецкага Саюза. Потым ордэн Леніна і медаль "Залатая Зорка" яму ўручыў К. К. Ракасоўскі.

**Славінскі, Ф. Герой дняпроўскай пераправы / Ф. Славінскі // Запаветы Леніна (Асіповічы). — 1989. — 25 мая. — С. 2.**